УДК 372.881.161

# ФАРМІРАВАННЕ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЙ АДУКАВАНАСЦІ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАЎ "БЕЛАРУСКАЯ МОВА" І "БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА"

*Мартынкевіч Святлана Васільеўна*

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаюцца асаблівасці арганізацыі працэсу навучання беларускай мове і беларускай літаратуры з пазіцыі фарміравання функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў. Прапануюцца заданні для фарміравання чытацкай адукаванасці, прыклады заданняў на развіццё чытацкіх кампетэнцый на ўроках.*

***Ключавыя словы:*** *функцыянальная адукаванасць; чытацкая адукаванасць; тэкст; чытацкія кампетэнцыі; віды тэкстаў; прыёмы работы з тэкстам.*

***Abstract.*** *The article discusses the features of organizing the process of teaching the Belarusian language and Belarusian literature from the perspective of developing students' functional literacy. It offers tasks for developing reading literacy and examples of tasks for developing reading competencies in lessons.*

***Keywords:*** *functional literacy; reading literacy; text; reading competencies; types of texts; methods of working with texts.*

На сучасным этапе развіцця адукацыі фарміраванне сацыяльна актыўнай асобы, якая ўсведамляе сябе грамадзянінам і патрыётам сваёй краіны, немагчыма без уліку такога складніка, як функцыянальная адукаванасць. Перш за ўсё гэта вызначаецца тым, што для развіцця ўсіх сфер сучаснага грамадства неабходны адукаваныя і канкурэнтаздольныя спецыялісты, якія могуць будаваць сваю дзейнасць і камунікацыю ў розных сферах жыцця. Адукацыйны працэс павінен быць арыентаваны на "формы і метады навучання навыкам XXI стагоддзя, развіццё гнасеалагічнага (інтэлектуальнага), інавацыйна-творчага, камунікатыўнага патэнцыялаў асобы" [3, с. 362].

"Канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь да 2030 года" вызначае ключавым кампетэнтнасны падыход да арганізацыі адукацыйнага працэсу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі [2]. Ён акрэслівае агульныя прынцыпы адбору зместу навучання, арганізацыі і ацэнкі адукацыі, мэтай якой становіцца сукупнасць ключавых кампетэнцый вучня (А.Л. Андрэеў, А.А. Вярбіцкі, В.Л. Жук, Л.Ф. Іванова, В.В. Краеўскі, А.В. Хутарскі і інш.).

У сучасным адукацыйным працэсе мэтавыя арыенціры навучання вучэбным прадметам "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" фарміруюцца згодна з вызначанымі метадычнымі падыходамі. Да арганізацыі працэсу навучання беларускай мове — з лінгваметадычнымі падыходамі — сістэмна-функцыянальным, камунікатыўна-дзейнасным, лінгвакультуралагічным; беларускай літаратуры — згодна з сістэмным, камунікатыўна-дзейнасным, культуралагічным, культуратворчым і аксіялагічным. Яны накіраваны на фарміраванне адпаведных кампетэнцый вучняў — моўнай, маўленчай, камунікатыўнай, культуралагічнай, літаратурнай, культуратворчай, каштоўнасна-светапогляднай — і ўключаюць комплекс ведаў, уменняў, якія забяспечваюць належны ўзровень валодання беларускай мовай і літаратурай.

Моўная кампетэнцыя складаецца з ведаў пра сістэму мовы на ўсіх яе ўзроўнях — фанетычным, лексічным граматычным, валодання правіламі функцыянавання моўных сродкаў у маўленні; нормамі літаратурнай мовы. Маўленчая кампетэнцыя дазваляе перадаваць думкі сродкамі мовы ў вуснай і пісьмовай форме і карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці. Літаратурная кампетэнцыя ўключае засваенне вучнямі ведаў пра літаратуру і рэалізаваных у разнастайных спосабах дзейнасці. Маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя забяспечвае здольнасць карыстацца мовай у розных відах маўленчай дзейнасці, свабодна ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў у адпаведнасці з мэтамі і задачамі зносін, нормамі культуры маўлення, правіламі маўленчых зносін. Культуралагічная кампетэнцыя падводзіць да ўсведамлення вучнямі мовы і літаратуры як феномена культуры, асэнсавання імі нацыянальна-культурнай спецыфікі беларускай мовы ў адзінстве з сусветнай мастацкай культурай.

У ліку згаданых мэтавых складнікаў метапрадметны падыход да арганізацыі адукацыйнага працэсу арыентуе мэты навучання на фарміраванне функцыянальнай адукаванасці, сутнасць якой разумеецца як інтэграваная здольнасць чалавека ажыццяўляць дзейнасць у грамадстве, вырашаць камунікатыўныя, пазнавальныя задачы, абапіраючыся на набыты сацыяльны вопыт. Важным сродкам фарміравання функцыянальнай адукаванасці з'яўляюцца практычныя задачы, заснаваныя на мадэляванні жыццёвых сітуацый. Для іх вырашэння вучням патрабуецца прымяняць міждысцыплінарныя веды, крытычнае і крэатыўнае мысленне, уменні працаваць з інфармацыяй, а таксама іншыя ключавыя кампетэнцыі.

У сваю чаргу функцыянальная адукаванасць уключае ў сябе чытацкую адукаванасць, матэматычную адукаванасць, прыродазнаўчую адукаванасць і фінансавую адукаванасць. Іх аб'ядноўвае комплекс такіх метапрадметных уменняў, як пошук, успрыманне, інтэрпрэтацыя інфармацыі, уменне адрозніваць факты ад іх інтэрпрэтацыі, супастаўленне і крытычная ацэнка інфармацыі, аналіз і дэкадзіраванне паведамлення; уменне вызначаць яго асноўную думку, супрацьстаяць маніпуляцыі падчас маўлення, якасна ства-

раць уласныя тэксты. З гэтага вынікае, што менавіта чытацкая адукаванаць і забяспечвае паўнавартасную працу з тэкстамі і інфармацыяй рознага характару і розных галін дзейнасці.

Чытацкая адукаванасць — здольнасць да разумення і асэнсавання пісьмовых тэкстаў, выкарыстання іх зместу для дасягнення ўласных мэтаў, развіцця ведаў і магчымасцей, неабходных для актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства; здольнасць асобы разумець і выкарыстоўваць, інтэрпрэтаваць інфармацыю з літаратурных і навукова-папулярных тэкстаў, уменне працаваць з графікамі, дыяграмамі, табліцамі і схемам і інш. Уменні, якія складаюць чытацкую адукаванасць, абагульненыя ў тры групы кампетэнцый: першая — знайсці і вылучыць інфармацыю, другая — інтэграваць і інтэрпрэтаваць, трэцяя — асэнсаваць і ацаніць. Задача настаўніка — выбраць спосабы работы з тэкстам і кагнітыўныя стратэгіі, накіраваныя на перапрацоўку інфармацыі з мэтай навучання, стварыць спецыяльныя ўмовы, каб арганізаваць працэс навучання чытанню тэкстаў з уключэннем метадаў, якія выкарыстоўваюцца для рашэння праблем, развіцця логікі, разважанняў, планавання і інш. Пры гэтым трэба памятаць, што інфармацыя — гэта яшчэ не веды, асобна ўзяты тэкст не забяспечвае фарміравання гнуткасці мыслення, сам па сабе не спрыяе засваенню ведаў.

На ўроках беларускай мовы асновай для фарміравання функцыянальнай, перш за ўсё чытацкай, адукаванасці з'яўляецца дыдактычныя тэксты, прычым не толькі мастацкія, але і навуковыя, афіцыйныя, публіцыстычныя, у тым ліку тэксты розных жанраў. Сучасны працэс навучання беларускай мове патрабуе выкарыстання тэкстаў так званай “новай прыроды”. Сярод іх суцэльныя тэксты, тэксты ў таблічнай форме, тэксты ў выглядзе інфаграфікі, графікі, кодавыя абазначэнні, фотаздымкі, рэклама і інш. “Падобныя тэксты разгортваюць карціну свету адпаведную запытам новых субкультур” [1, с. 114]. У сістэму работы з тэкстамі згаданай прыроды варта ўключаць заданні па розных напрамках функцыянальнай адукаванасці, накіраваныя:

— на трактоўку навучэнцамі інфармацыі аб аб'екце, прадстаўленай у тэкставай або графічнай формах;

— вылучэнне падобных і розных уласцівасцей вывучаемага аб'екта або з'явы;

— усталяванне падабенства (аналогіі) малавывучанага аб'екта з добра вядомым аб'ектам у форме гіпотэзы;

— прымяненне прыёму мадэлявання;

— фармулёўку высноў на аснове прапанаваных дадзеных;

— знаходжанне шляхоў вырашэння праблемных жыццёвых сітуацый;

— ацэнку і крытычнае асэнсаванне інфармацыі і інш.

Віды дзейнасці, якія звязаны з фарміраваннем чытацкай адукаванасці, наступныя:

— паведамленне на аснове матэрыялаў вучэбнага дапаможніка;

— складанне плана, тэзісаў тэксту;

— самастойнае складанне табліц, схем, алгарытмаў, апорных канспектаў для абагульнення і сістэматызацыі вывучанага матэрыялу;

— пераканструяванне сказаў, тэкстаў;

— аналіз тэксту/тэкстаў (супастаўляльны, комплексны);

— пераказ, сачыненне, комплекснае заданне.

З мэтай фарміравання ўменняў пошуку інфармацыі пры навучанні беларускай мове мэтазгодна выпрацоўваць у вучняў навыкі разумення сутнасці сфармуляванага задання (“Пра што гэта заданне?”, “Што трэба зрабіць, каб яго выканаць?”). Варта прапаноўваць вучням тлумачыць, якім чынам яны знайшлі/выбралі патрэбную частку тэксту, ключавыя словы/выразы для адказу на пытанне.

Актывізуюць працу вучняў заданні, у якіх для стварэння адказу на пытанне можна выкарыстаць прыём перафразіравання (лінгвістычны эксперымент), сінанімічныя замены. У сістэме фарміравання функцыянальнай адукаванасці варта вучыць самастойна фармуляваць пытанні, адказы на якія знаходзяцца ў адным або некалькіх фрагментах тэксту і інш. Творчыя заданні павінны быць матывацыйнымі, гэта значыць, у іх фармулёўцы неабходна задаваць параметры сітуацыі маўленчых зносін, для якой ствараецца тэкст. Сітуацыі і тэмы, прапанаваныя навучэнцам, павінны быць як блізкімі, актуальнымі для адпаведнага ўзросту, так і, магчыма, на дадзены момант неактуальнымі, але запатрабаванымі ў будучыні.

*Напрыклад*, практыкаванне на аснове працы з рэкламным тэкстам (дадатак, малюнак 1): *Вызначце, якія віды маніпуляцыі схаваны ў прапанаванай рэкламе.*

Вучняў варта пазнаёміць з відамі рэкламнай маніпуляцыі: 1 — выкарыстанне жаданняў, захапленняў (маніпуляванне патрэбамі); 2 — фарміраванне ідэалаў і каштоўнасцей (духоўнае маніпуляванне); 3 — навязлівы выклад уласнай думкі (інтэлектуальнае маніпуляванне); 4 — выкарыстанне эмоцый (маніпуляванне пачуццямі); 5 — фарміраванне ўстойлівай рэакцыі на пэўныя сімвалы (сімвалічнае маніпуляванне).

Далей вучням можна прапанаваць заданне: *Расшыфруйце сказ: аднавіце графічныя абрысы слоў [ЧЫМКАЗАЦ'/ЛЕПШПАСМАКАВАЦ']. Як вы разумееце яго значэнне? Як называецца гэты выраз? Падбярыце іншыя ўстойлівыя выразы з такім значэннем. Складзіце тэкст для рэкламы з улікам інфармацыі пра віды рэкламнай маніпуляцыі і малюнка. Уключыце ў тэкст рэкламы прыведзеныя вамі ўстойлівыя выразы.*

На ўроках беларускай літаратуры фарміраванне функцыянальнай адукаванасці, найперш чытацкай, адбываецца пры вывучэнні мастацкіх твораў і звязана з уменнямі пошуку пэўнай інфармацыі ў тэксце, яе інтэрпрэтацыі, ацэнкі зместу і формы тэксту, стварэння ўласнага тэксту.

Для фарміравання чытацкай адукаванасці на ўроку літаратуры неабходна прыняць пад увагу віды сэнсавай інфармацыі, якая змяшчаецца ў тэксце. Гэта змястоўна-фактуальная інфармацыя (пра што тэкст); змястоўна-канцэптуальная інфармацыя (аўтарскае

стаўленне); змястоўна-падтэкставая інфармацыя (розныя формы прычынна-выніковай сувязі, сэнсаў, падтэксту, аналіз характару адносін аўтара да выказвання, перадачы яго эмацыйнага стану).

Пры гэтым варта задзейнічаць усе віды чытання, якія падзяляюць на наступныя групы: па ўдзелу псіхічных працэсаў (рацыянальнае, эмацыянальнае); па мэтах (азнаямляльнае, функцыянальнае, эстэтычнае); па ступені асэнсавання інфармацыі (рэпрадуктыўнае, творчае); па матывах (забаўляльнае, афіцыйнае); па хуткасці (праглядавае (сканіраванне, пошукавае), аналітычнае).

Спосабы работы з тэкстам вызначаюцца з улікам таго, што тэкст – гэта ланцужок прычынна-выніковых сувязей, якія варта супастаўляць з мінулым чытацкім вопытам і ўменнямі вучняў зразумець закладзеную інфармацыю. З кагнітыўнымі стратэгіямі суадносяцца канкрэтныя спосабы развіцця чытацкіх кампетэнцый на ўроку:

– аналіз тэксту, яго дэкадзіраванне;
– пераўтварэнне тэксту ў іншую знакавую сістэму;
– вызначэнне дакладнасці, сапраўднасці інфармацыі, яе крыніц;
– стварэнне рэкламнага роліка ці тэксту;
– інтэрв'ю з літаратурным героем;
– рэпартаж з месца падзей у творы;
– стварэнне газеты;
– абмеркаванне экранізацый, музычных інтэрпрэтацый, тэатральных пастановак, ілюстрацый і параўнанне з тэкстам;
– стварэнне лэпбука, выпуск фэнзіна (рукапіснага часопіса);
– складанне воблакаў слоў, інтэлект-карт і інш.

Настаўніку пры падрыхтоўцы да ўрока варта адшукаць у мастацкім тэксце моманты нявызначанасці, якія дазваляюць чытачу выбіраць паміж рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэньваць якасць і сапраўднасць падзей у тэксце. Неабходна вучыць разважаць, як твор чытаецца, пра структуру, мову, сістэму вобразаў, якія праграмуюць той ці іншы спосаб яго чытання; вызначаць, наколькі тэкст сугучны сённяшняму дню.

У працэсе работы з мастацкім творам прапануецца выкарыстоўваць заданні, арыентаваныя на практычную дзейнасць і сувязь са штодзённым жыццём. Напрыклад, такія, як 1 – параўнальны аналіз пейзажных карцін у мастацкім творы і навакольнай прыроды; 2 – дыспуты пра маральны выбар герояў твораў; 3 – стварэнне інтэрнэт-старонак, прысвечаных памятным падзеям, апісаным у літаратурных творах; 4 – напісанне ліста ветэрану, заснаванага на ўражанні аб вывучаным творы пра Вялікую Айчынную вайну.

Дыдактычную вартасць маюць заданні, якія дазваляюць звязаць вывучаемы матэрыял з асабістым сацыяльным вопытам і ўяўленнямі пра паводзіны людзей у грамадстве: 1 – інсцэніраванне фрагментаў мастацкіх твораў і абмеркаванне; 2 – стварэнне альтэрнатыўных сюжэтных ліній, фіналаў твораў з улікам змен у характарах герояў, іх учынках; 3 – літаратурныя віктарыны, эстафеты, конкурсы; 4 – падрыхтоўка літаратурных экскурсій.

Да заданняў, накіраваных на выяўленне асабістых адносін вучняў да аўтара, мастацкага твора, яго герояў, аднясем 1 – разгляд партрэта, вызначэнне рыс і асаблівасцей характару пісьменніка, адлюстраваных на партрэце (фотаздымку), стварэнне выказвання на аснове біяграфічных звестак. *Напрыклад,* заданне: *Якія рысы характару Уладзіміра Караткевіча адлюстраваліся на фотаздымку (дадатак, малюнак 2)? Ці можна па фотаздымку расказаць пра характар чалавека? У які перыяд жыцця, на вашу думку, быў зроблены гэты фотаздымак? Ці выпадковы прапанаваны калаж фотаздымка і выявы на другім плане? Пра што можа расказаць фон, абраны для калажа, і выява пісьменніка на фотаздымку? Як прапанаваны калаж суадносіцца з тэматыкай творчасці Уладзіміра Караткевіча?* і інш; 2 – маляванне героя; 3 – падбор ілюстрацый, стварэнне вокладкі для кнігі; 4 – дзённікавыя запісы героя; 5 – падрыхтоўка эмацыянальнай партытуры настрою героя; 6 – складанне дыягнастычнай карты паводзін героя і інш.

Асобную групу ў сістэме фарміравання функцыянальнай, у прыватнасці, чытацкай адукаванасці на ўроках беларускай мовы і літаратуры складаюць заданні на развіццё культуры маўлення вучняў, уменняў карэктна ставіцца да іншых меркаванняў і праяўляць паважлівыя адносіны да суразмоўцаў.

Такім чынам, выкарыстанне індывідуальных і групавых (камандных) форм работы ва ўмовах актыўных зносін, уключэнне заданняў на авалоданне навыкамі рэфлексіі накіроўваюць на дасягненне якасных адукацыйных вынікаў, вызначаюць функцыянальнасць урока, а значыць яго адукацыйную вартасць.

## Спіс літаратуры


1. Васюковіч, Л.С. Праца з тэкстам як аснова фаміравання функцыянальнай пісьменнасці вучняў : манаграфія / Л.С. Васюковіч. – Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава, 2024. – 177 с.

2. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года // Министерство образования Республики Беларусь. – URL: https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda (дата обращения: 03.10.2025).

3. Теоретико-методологические основания дошкольного, общего среднего и специального образования в Республике Беларусь. В 2 ч. Ч. 1. / Н. П. Баранова [и др.] ; под науч. ред. В.Ф. Русецкого. – Минск : Национальный институт образования, 2023. – 480 с.

Дадатак




Малюнак 1



Малюнак 2

*Дата поступления в редакцию: 11.11.2025*

УДК 37.013

# МЕЖПРЕДМЕТНАЯ ИНТЕГРАЦИЯ КАК РЕСУРС РАЗВИТИЯ МЕТАПРЕДМЕТНЫХ КОМПЕТЕНЦИЙ

*Мильман Алла Михайловна*

***Аннотация.*** *Статья посвящена межпредметной интеграции как ресурсу развития метапредметных компетенций. Определены актуальность темы, даны основные понятия в их современном значении, а также проблемное поле, в котором работает учитель, реализуя целеполагание по формированию метапредметных компетенций. Автор исследует соотношение понятий функциональная грамотность, компетенции, метапредметность, метапредметные компетенции и их содержательную сущность – универсальные учебные действия. Автор указывает на функциональность межпредметной интеграции как ресурса метапредметных компетенций. В статье прослеживается взаимообусловленность развития универсальных учебных действий с теорией поэтапного их формирования П.Я. Гальперина и их классификация, данная школой А.Г. Асмолова Автор приводит примеры технологий, методов и приемов формирования и развития УУД, связывая их эффективное развитие с межпредметной интеграцией.*

***Ключевые слова:*** *функциональная грамотность, метапредметные компетенции, универсальные учебные действия, межпредметная интеграция.*

***Abstract.*** *The article is devoted to interdisciplinary integration as a resource for the development of metasubject competencies. The relevance of the topic is determined, the basic concepts in their modern meaning are given, as well as the problem field in which the teacher works, implementing goal-setting for the formation of meta-subject competencies. The author examines the relationship between the concepts of functional literacy, competencies, meta–subject, meta-subject competencies and their substantive essence – universal learning activities.The author points to the functionality of interdisciplinary integration as a resource of metasubject competencies. The article traces the interdependence of the development of universal educational actions with the theory of their step-by-step formation by P.J. Galperin and gives their classification given by the school of A.G. Asmolov. The author provides examples of technologies, methods and techniques for the formation and development of management systems, linking their effective development with interdisciplinary integration.*

***Keywords:*** *functional literacy, meta-subject competencies, universal learning activities, interdisciplinary integration.*

В XXI в. именно образованию предстоит научить человека не только структурировать большие объемы информации, но и предать ей ценностный смысл, а значит, гуманизировать: образование как ценность личностная – перспектива жизнеспособности и качественности образования [8].

Качество образования сегодня определяется социальной значимостью, так что образованность как «ценность личностная» направлена на изменение образа с учетом запросов социума и собственных устремлений. Под изменением образа нами понимается готовность человека осваивать способы действий, определяющие умение учиться, познавать мир и себя, идентифицировать себя с позиции гражданственности, ценностно-ментальной, национальной общекультурной.

Современная учебно-познавтельная деятельность базируется на трех основных понятиях: *функциональ-*